Герасіменка В.І., студ. гр. 203
ФТБКіСМ БДУ культуры і мастацтваў.
Навуковы кіраўнік – Пладунова Т.А., выкладчык

# ВОПЫТ МАСТАЦКАГА РЭКАНСТРУЯВАННЯ ЭТНАФОНІІ АБРАДУ "МАСЛЕНІЦА" У СУЧАСНЫХ УМОВАХ

Масленіца – адно з старажытных свят, якое несла супольную ідэю захавання роду, прадаўжэння жыцця ў часе і прасторы. Разам з гэтым адметнай ідэяй урачыстасцяў было набліжэнне вясны. Масленіца на тэрыторыі Беларусі з даўніх часоў была звязана з культам Бога Вялеса, які па міфалагічных уяўленнях старажытнага чалавека з'яўляўся ўладальнікам хтанічнага свету [3, ст. 185]. Для селяніна, у якога хатняя жывёла складала значную частку яго гаспадаркі, было важным засцерагчы ад злых духаў і хвароб менавіта сваю хатнюю жывёлу. Гэта паспрыяла пераходу Вялеса ў апекуны хатняй жывёлы. Багацце страў з малака ў час Масленіцы зрабіла іх традыцыйнай абрадавай на гэтае свята і дало яму назву. Нездарма ў некаторых мясцовасцях Масленіцу называюць Сырніцай [1, ст. 172] Носьбіты традыцыйнай свядомасці лічылі, што спажыванне багатай рытуальнай ежы на Масленіцу прынясе багацце на ўвесь будучы год.

Масленіцу святкавалі два тыдні на памежжы зімы і вясны, прымеркавана яна да пачатку Вялікага паста[1] – першага яго тыдня – які мае назву Мясапуст, нельга есці мяса, але дазваляецца ўжываць малочныя прадукты. Масленіца прадугледжвала разгортванне шэрагу абрадавых дзеянняў, якія складаліся з некалькіх частак, якія паўтараюцца амаль ва ўсіх каляндарных святах: ушанаванне продкаў, абрадавы абход, заклінальная частка, ігрышча і святочная трапеза. Амаль цалкам гэты традыцыйны сцэнар быў увасоблены ў мастацкай рэканструкцыі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

---

[1] З прыходам на тэрыторыю Беларусі хрысціянства адбывалася пераасэнсаванне існуючах каляндарных святаў праз прызму хрысціянскіх традыцый. Кожнае хрысціянскае свята дапасоўвалася да язычніцкага, якое адбывалася ў той самы час, альбо было найбліжэйшае да яго. На час правядзення Масленіцы ў хрысціянскай традыцыі не знайшлося вялікага свята, памеры якога адпавядалі б масленічным ігрышчам.

Масленіцы ў музеі народнай архітэктуры і побыту ў в.Строчыцы, што пад Мінскам. Цяжка рэканструяваць свята дакладна паводле традыцыі, бо трэба ўлічваць сучасныя ўмовы, матывацыю і ментальнасць удзельнікаў і гледачоў. Але арганізатары і гурты, якія прымалі ўдзел у свяце здолелі адаптаваць яго пад сучасныя ўмовы, выкарыстаць рэсурсы музея і свой талент для аднаўлення абраду. Пры гэтым назіраць за святам сабраліся шматлікія гледачы, якія з задавальненнем удзельнічалі ва ўсіх абрадавых дзеях.

У сучаснасці ўсё больш узрастае цікавасць грамадскасці да вывучэння і рэвіталізацыі фальклору. У гэтым прымаюць актыўны ўдзел музеі, установы культуры і навукі, творчыя калектывы, а таксама студэнты, звязаныя па будучай прафесіі з дзейнасцю такога роду. Аўтар дадзенага артыкула прымала ўдзел у складзе гурта "Вяснянка" (203 група) у масленічных святкаваннях у музеі ў в. Строчыцы. Для гэтага наша група пад кіраўніцтвам выкладчыка Пладуновай Т. А. выканала даследчую працу: сабрала інфармацыю аб абрадавым свяце і яго рэгіянальных адметнасцях, асэнсаванне якой было ўвасоблена ў абрадавай карце (па методыцы выкладчыка). Абрадавая карта ўключае ў сябе дэталізаванае апісанне рытуальных падзей у храналагічным парадку, кожная з якіх раскладзена па прыкметах-сімвалах, сукупнасць якіх утварае агульную карціну абрадавага дзеяння[2] [2, ст. 172].

Заняткі па прадмеце "Рэжысура каляндарных абрадаў" дазволілі мне сфарміраваць тэарытычную базу для сцэнарнага плана мастацкай рэканструкцыі свята. Мастацкі кіраўнік нашага студэнцкага фальклорнага

[2] У распрацоўцы абрадавай карты Т.А. Пладунова абапіралася на на методыку даследавання традыцыйных абрадаў расійскіх вучоных М.І. і С.М. Талстых, якія ўяўлялі абрадавую дзею як сукупнасць раўназначных па функцыянальна-семантычнай нагрузке кодаў. Паводле высноў даследчыкаў архітэктоніка гэтых кодаў выбудоўваецца наступным чынам: тэмпаральны код – час правядзення абраду (свята); акцыянальны код – ход абрадавых падзей; лакатыўны код – месца правядзення абраду (свята); персанальны код – кола ўдзельнікаў, наяўнасць маскіраваных персанажаў; атрыбутыўны код – выкарыстанне абрадавых атрыбутаў, адзення, маскіравання; музычны код – тыпавыя напевы з адмысловымі этнафанічнымі прыкметамі і гукаідэал інструментльнай этнафоніі; вербальны – наяўнасць заклікаў, замоў, зычэнняў у абрадзе.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гурта “Вяснянка” Петухова Н.В. развучыла з намі масленічныя песні рознага характару, якія адлюстроўваюць музычна-вербальны код абраду.

Намі былі расшыфраваны і пераняты песні пэўных рэгіёнаў (Цэнтральная Беларусь, Падняпроўе, Падзвінне), у якіх вылучаецца багацце напеваў і тэкстаў. Для масленічных тэкстаў характэрна тэматычная і жанравая разнастайнасць, багацце на эпітэты (“Масленіца шчаслівая”, “каўзуха”, “палізуха”, “калатуха”).

Такім чынам намі былі засвоены песні, функцыянальнасць выканання якіх адпавядае наступным жанрам масленічнай этнафоніі: масленкі, звернутыя да персаніфікаванага вобраза свята; віншаванні-пажаданні, адрасаваныя маладой замужніцы; дражнілкі, звернутыя да дзяўчат і хлопцаў, што ў належны час не жадалі ці не патрапілі ўзяць шлюб; песні любоўна-шлюбнай тэматыкі, песні-перавёртышы; песні-пікіроўкі паміж хлопцамі і дзеўкамі; песні пры гушканні на арэлях; карагодныя масленкі; сямейна-бытавыя песні; песні з самаіроніяй [1, ст. 173-184].

Пры развучванні масленічных песень рознай функцыянальнай скіраванасці вялікую ўвагу мы надавалі рэгіянальным этнафанічным асаблівасцям. Веснавая дапасаванасць этнафоніі беларускіх масленічных песень выяўляецца ў клічнай, загукальнай інтанацыі, гэта “вулачныя”, “галосныя” спевы на адкрытай прасторы. Так рытуальныя песні земляробчага прызначэння (“як на качэлях калышуцца”, “як вясну гукаюць”) выконваюцца у заклінальным, эмацыйна-прыўзнятым ключы (сігнальнасць зачынаў і поклічаў-рэфрэнаў), з напружана-звонкай, моцнай падачай гуку, часам, у даволі высокай танальнасці. Немалаважнай этнафанічнай прыкметай зяўляюцца і стылі выканання, якія прадстаўлены у рэгіянальнай этнафоніі рознымі тыпамі фактуры і інтанавання: манодыя, пластычнасць, узорыстасць меладычнай лініі, мяккасць інтанацыйных паваротаў пры устойлівасці складовай і музычна-рытмічнай формы ў выкананні масленак на Падзвінні, дыяфонія “з пералівамі” ў традыцыі паўднёвага усходу і гетэрафонна-бурдонная арганізацыя галасоў у спеўнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

суполцы поўдня. Пад кіраўніцтвам Н.В. Пятуховай намі былі ўвасоблены адзначаныя асаблівасці ў развучаных песнях Падняпроўя і Падзвіння. У межах вучэбнай практыкі "Вяснянка" прыняла ўдзел у абрадавым свяце Масленіцы, што ладзілася ў музеі ў в. Строчыцы, і выканала масленічныя абрадавыя песні, карагоды і танцы ў складзе студэнцкага гурта "Талака" пад кіраўніцтвам В.В.Калацэя. Выступленне гурта было прымеркавана да заклінальна-абуджальнай часткі абраду. На вялікай пляцоўчы на самым высокім узгорку на тэрыторыі музея было раскладзена вогнішча, на якім "панавала" антрапаморфная фігура Марэны, хтанічнага боства зімы-смерці, якая ў традыцыйнай свядомасці трактавалася як старасць года. "Вясняка" (203 група) і "Любошчы" (403 група) па чарзе і супольна спявалі масленкі, абуджаючы гукам паветра, як бы паскараючы гэтым набліжэнне вясны. Прыпевы гучныя і энергічныя былі прызначаны быць чутнымі далёка і ўскалыхнуць прастору. Уперамежку з песнямі выконваліся розныя побытавыя танцы і прымеркаваныя да вясны гульні, што спрыяла вытаптванню і раставанню снегу пад нагамі (гэтая частка сімвалізавала абуджэнне зямлі). На дудах, скрыпцы і барабане ігралі хлопцы з гурта "Раме" (303 група). Танцавальна-гульнёвая частка плаўна перайшла ў масленічную карагодную, бо танцы па крузе і спевы ў карагодах прымяняюць магічную сілу круга, уяўленні аб якой бытавалі ў народзе. Спевы і карагоды ладзіліся вакол пудзіла Марэны, якое ў час аб'яднання ў іх спеўнай і кінестычнай энергіі грамады, было запалена.

Арганізатары свята (супрацоўнікі музея) звярталіся да рэгіянальных традыцый Масленіцы, таму сучасная мастацкая рэканструкцыя паспрыяла прыжыванню народнай традыцыі ў святочным календары мінчан. Некаторыя даследчыкі лічаць мэтазгодным стварэнне фальклорна-этнаграфічная тэатра пры музеі для таго, каб правядзенне святаў у музеі набывала рэгулярны характар і мелася магчымасць "на заказ" рэканструяваць святы розных рэгёнаў Беларусі і надання ім відовішчнасці і традыцыйнасці [4, 60] Увогуле рэканструкцыя Масленіцы ў музеі ў в.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Строчыцы прайшла добра, як кажуць: “Масленая шчаслівая, прасцягніся да Вялікадня”, падкрэсліваючы жаданне падоўжыць свята.

Літаратура:

1. Каляндарная абрадавая паэзія / А. С. Ліс, А. І. Гурскі, В. М. Шарая, У. М. Сівіцкі; Навук. Рэд. А. С. Фядосік. – Мн.: Бел. Навука, 2001. – 515 с. – (Беларускі фальклор: Жанры, віды, паэтыка; Кн. 1).
2. Пладунова Т. Засваенне і актуалізацыя каляндарна-абрадавых традыцый у сучаснай культурна-адукацыйнай прасторы»// Аўтэнтычны фальклор: праблемы вывучэння, захавання, пераймання: зборнік навуковых прац удзельнікаў IV Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі (Мінск, 29-30 красавіка 2010 г.) / БДУКМ; рэдкал.: Мажэйка М.А. (адк. Рэд.) [і інш.]. – Мінск: БДУКМ, 2010. – 168 с.
3. Традыцыйнай мастацкая культуа беларусаў. У 6 т. Т. 1. Магілёўскае Падняпроўе / Т. Б. Варфаламеева, В. І. Басько, М. А. Козенка і. інш. – Мн.: Бел. Навука, 2001. 797 с.
4. Штудыі Рэспубліканскай сезоннай фальклорнай школы. / укладальнік В. В. Калацэй; рэд. Кал. В. Калацэй (адк. Рэд.) [і інш.] – Мн.: БДУ культуры і мастацтваў, 2007. – 72 с. : іл.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ